Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛЮТАГА 2017 г. СУБОТА № 39 (28403)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Урокі скончыліся — шагам марш!

СТАР. 5



## З яго пачынаўся айчынны біятлон

СТАР. 9



## Беларускі бестыярый «прапісаўся» ў Гомелі

СТАР. 23

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Беларусь і Расія сёння блізкія да ўзгаднення ўмоў паставак газу. Мы павінны вырашыць гэтае пытанне, дабіцца істотнага зніжэння цаны на прыродны газ. Мы займаемся гэтым амаль паўтара года. Мы намалявалі траекторыю руху да адзінага рынку электраэнергіі і адзінага рынку газу і нафты, траекторыя паніжэння цаны ёсць. Мы, хутчэй за ўсё, прывяжамся да ўнутрырасійскіх цэн, гэта, па меншай меры, апошні ўзгоднены варыянт нашай дарожнай карты, г. зн. пратакола».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8774 | ▲ |
| Еўра | 1,9875 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17039>

# ДЗІСЕНСКІЯ ЧАРАЎНІЦЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Гаспадыня аграсядзібы «Дастатак» з горада Дзісна Мёрскага раёна Лілія АРЦІМЁНАК і дырэктар гарадскога Дома рамёстваў Алена БАЛАШ па старых фотаздымках і паводле архіўных звестак адрадзілі дзісенскія жаночыя строі, якія бытавалі яшчэ да сярэдзіны мінулага стагоддзя і якія насілі заможныя гараджанкі. Пры першай магчымасці выступіць альбо паўдзельнічаць у святочных імпрэзах сяброўкі Лілія і Алена прыбіраюцца ў гэтае адзенне, выробленае рукамі руплівых дзісенскіх майстрых.**

■ Расклад на заўтра

## УСТУПНЫЯ ІСПЫТЫ РЭФАРМУЮЦЬ?

### А ў школах могуць увесці так званыя міністэрскія кантрольныя работы

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА ўпэўнены, што фарміраванне іміджу педагога — задача ўсяго грамадства, а не толькі Міністэрства адукацыі: «Сёння мы часта сустракаем у СМІ спробы супрацьпастаўлення бацькоў і школы, педагогаў і вучняў, у той час як усе яны — удзельнікі адукацыйнага працэсу, якія працуюць на адну мэту. Настаўнік і выкладчык — ключавое звяно ў адукацыі: нават самая дасканалая вучэбная праграма, таленавіта напісаны падручнік не дадуць патрэбнага выніку, калі не акажуцца ў руках прафесіянала».**

**На выніковай калегіі свайго ведамства Ігар Карпенка агучыў намер стварыць пры Міністэрстве адукацыі Грамадскі савет па пытаннях адукацыі, у які ўвойдуць палітыкі, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі культуры, сістэмы адукацыі, аховы здароўя і бацькі... Гэта значыць, тыя людзі, якія звязаны з сістэмай, але не працуюць непасрэдна пад кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі. «Савет стане своеасаблівай пляцоўкай для вызначэння магчымых рызык, якія могуць паўстаць у сістэме адукацыі», — патлумачыў Ігар Карпенка. — Сістэма адукацыі ў Беларусі выбудавана. У той жа час яна павінна развівацца, адаптавацца як да знешніх, так і да ўнутраных фактараў, якія ўзнікаюць у краіне і за яе межамі. Формы і метады работы будуць карэктавацца з улікам рэалій».**



На выстаўцы вучэбнай літаратуры перад калегіяй.

СТАР. 7

■ Разумныя грошы

## РУБЕЛЬ НАСТУПАЕ ПА ЎСІХ «ФРАНТАХ»

### Аднак пры выбары дэпазітаў трэба звяртаць увагу не толькі на памер працэнтаў

**Днямі мне на электронную пошту трапіў рэкламны ліст ад аднаго камерцыйнага банка, дзе прапанавалася пакласці рублі на безадзыўны ўклад на 18 месяцаў пад 17% гадавых. Цудоўная прапанова, адразу падумаў я, бо працэнты па валютных укладах у разы меншыя, а долар у нас працяглы час «стаіць», або нават таннее. Прынадная прапанова, нават вельмі, таму вырашыў спачатку разабрацца з ёй, так мовіць, з лупаю ў руках непасрэдна на месцы...**

### Тэрмін вялікі, а стаўка «плавае»?

А ў банку мне паведамілі, што агучаныя 17% гадавых будуць гарантавана «капаць» на мой будучы дэпазіт толькі на старце ўсяго тэрміну захоўвання. А потым умовы дэпазіту дапускаюць змяненне банкам у аднабаковым парадку гэтай стаўкі, пасля папярэдняга апавяшчэння ўкладчыка. Што ў нас тады атрымліваецца? Уклад безадзыўны, таму грошы з банка можна будзе забраць толькі праз паўтара года. Дапусцім, што банк ужо праз некалькі месяцаў істотна паменшыць працэнтную стаўку па ўкладзе. У гэтым выпадку кліент на працэнтную палітыку банка паўплываць ніяк не зможа, бо ў дагаворы недзе там унізе сапраўды прапісана, што стаўка «плаваючая». Але тут узнікаюць слушныя пытанні наконт таго, як моцна тая ці іншая фінансавая ўстанова можа «падрэзаць» абяцаныя ў рэкламе працэнты.

Спецыяліст выбранага мною банка супакоіла, што іх працэнтная палітыка залежыць ад агульнай тэндэнцыі на рынку, рэкамендацый Нацбанка і змянення памеру стаўкі рэфінансавання. Менавіта на апошнюю акалічнасць банкі звычайна і звяртаюць увагу, адзначыла яна. Напрыклад, у іх цяпер існуе такі рублёвы безадзыўны ўклад, па якім працэнты будуць карэктавацца толькі тады (і на адпаведную велічыню), калі рэгулятар знізіць стаўку рэфінансавання. На мой погляд, гэта ўжо больш зразумелы для людзей механізм, але ў гэтым выпадку працэнтная стаўка па ўкладзе нават на старце складае не 16—17%, а толькі 12—13% гадавых. У падобных дагаворах такія ўмовы так і прапісваюць, што ваша стаўка па ўкладзе складае 13% або — стаўка рэфінансавання мінус 2 працэнтныя пункты (СР — 2 п. п.) Сёння СР складае 16%, таму пасля зніжэння яе на 1—2% у адпаведных прапорцыях паменшыцца і даходнасць нашых дэпазітаў.

СТАР. 3